Па законе

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПРАВАПАРАДАК

## Генпракуратура ініцыюе прынянцце дадатковых мер па стабілізацыі сітуацыі ў краіне

**Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй ШВЕД перад пачаткам каардынацыйнай нарады па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, перадае БелТА.**

«Яе асноўная мэта — сумесна з праваахоўным блокам, іншымі кампетэнтнымі органамі і арганізацыямі выпрацаваць тактыку і стратэгію дзеянняў па рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы і забяспечыць правапарадак у краіне, — падкрэсліў Андрэй Швед. — Праблемныя пытанні ўзаемадзеяння ўсіх дзяржаўных органаў у дадзеным становішчы, асабліва ў частцы грамадскай бяспекі, нам добра вядомыя. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне мае скаардынаванасць нашай працы. Яна павінна быць накіраваная на апярэджанне падзей і мець канкрэтны практычны вынік у найбліжэйшы час».



Генеральны пракурор вызначыў некаторыя важныя кірункі для канцэнтрацыі намаганняў. «Першае — мэтанакіраваная праца па забеспячэнні няўхільнасці пакарання арганізатараў і актыўных удзельнікаў пратэсных акцый, кампенсацыі прычыненага ўсімі вінаватымі матэрыяльнага ўрону. Праваахоўныя і іншыя дзяржаўныя органы працуюць над высвятленнем усіх грамадзян, якія здзейснілі супрацьпраўныя дзеянні ці парушылі грамадскі парадак за перыяд з 9 жніўня. У гэтай частцы намечаны і будзе рэалізаваны комплекс дадатковых мер па актывізацыі работы. Вызначаны дакладны алгарытм узаемадзеяння для ўстанаўлення сум нанесеннай у ходзе незаконных масавых мерапрыемстваў шкоды і парадак іх спагнання. Падыход адзін: прыйшоў на несанкцыянаваную акцыю — будзеш пакараны рублём. І сумы гэтыя вельмі істотныя», — адзначыў ён.

Другі кірунак — абарона правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх, уцягнутых бацькамі і іншымі асобамі ў незаконных масавыя мерапрыемствы. «Органам унутраных спраў даручана неадкладна выяўляць такіх асоб і звесткі пра іх перадаваць у органы апекі і папячыцельства або пракурорам для прыняцця ўсіх законных мер уздзеяння, каб не дапусціць падобных фактаў у далейшым. Трэцяе — вызначаны формы і метады работы шэрагу дзяржаўных органаў, накіраваныя на выяўленне і спыненне любых відаў парушэнняў закона з боку моладзі, асабліва ва ўстановах адукацыі. Запатрабавана ўзмацніць прафілактычную і ідэалагічную работу ў маладзёжным асяроддзі», — дадаў Андрэй Швед.

Генеральны пракурор падкрэсліў: «Ні адзін блогер, ні адна асоба, якая ўчыніла злачынства не толькі на несанкцыянаваных мерапрыемствах, але і ў інтэрнэце, не сыдзе ад адказнасці. Сёння вядзецца вельмі актыўная работа па выяўленні такіх асоб і прыцягненні іх да адказнасці. У бліжэйшыя некалькі месяцаў грамадскасць даведаецца пра вынікі гэтай работы з дапамогай адкрытага судовага разгляду шэрагу крымінальных спраў, дзе з улікам атрыманых бясспрэчных доказаў вы пераканаецеся ў тым, што праваахоўныя органы толькі будуць нарошчваць свае намаганні па спыненні і выяўленні падобнага роду злачынстваў і правапарушэнняў».

«Што датычыцца агульнай злачыннасці, сітуацыя абсалютна кантралюемая. Наадварот, мы адзначаем зніжэнне агульнай крымінальнай злачыннасці па большасці састаў злачынстваў. Гэта сведчыць, што праваахоўныя органы разам са складанымі задачамі, выклікамі і пагрозамі, якія вырашаюць цяпер, не забываюць і спраўляюцца з тым, што злачыннасць знаходзіцца пад поўным і жорсткім кантролем, — сказаў Андрэй Швед. — Што датычыцца грамадскага парадку ў сталіцы і іншых населеных пунктах, вы бачыце — сітуацыя кантралюемая. З кожным днём яна паляпшаецца».

Спорт

# У беларускай лёгкай атлетыкі новы кіраўнік

**24 верасня на пазачарговай канферэнцыі грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі» старшынёй федэрацыі быў абраны Іван Ціхан. Яго кандыдатуру прапанаваў экс-старшыня Вадзім Дзевятоўскі: «Я хачу прапанаваць на пасаду чалавека, які для мяне як брат, — гэта Іван Ціхан. Ён як ніхто іншы ведае, што такое цяжкасці. На Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра ён паказаў усім, «дзе ракі зімуюць». За кандыдатуру Івана Ціхана прагаласавала 68 дэлегатаў канферэнцыі, супраць — 1.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Свой заўчасны сыход з пасады Вадзім Дзевятоўскі, які ўзначальваў федэрацыю лёгкай атлетыкі з 2014 года, растлумачыў станам здароўя: «Я жыў праблемамі лёгкай атлетыкі, я веду душы нашых спартсменаў. Я кожную хвіліну думаў, што зрабіць яшчэ, каб мы былі найлепшыя. І арганізм даў збой, мне неабходна аднаўленне. Гэта вымушаная мера, мне не хочацца спыняць наш хуткі тэмп працы. Апошнія гады лёгкая атлетыка гучыць часцей, мы бачым, як растуць вынікі нашых чэмпіёнаў, як развіваецца дзіцячая лёгкая атлетыка. Гэта сігнал для нас усіх, што зроблена вялікая праца і пасеяны зярняткі, якія будуць даваць плады. Я ўпэўнены, што задачы, пастаўленыя перад федэрацыяй, будуць выкананы. А я, як толькі вырашу ўласныя праблемы, пастараюся вярнуцца».

Вадзім Дзевятоўскі і Іван Ціхан — славутыя лёгкаатлеты-малатабойцы. Былы старшыня федэрацыі — чэмпіён свету ў штурханні молата, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў — 2008, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Новы старшыня Іван Ціхан плануе сумяшчаць кар'еру кіраўніка федэрацыі і спартсмена. Зараз ён рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў у Токіа, якія стануць для яго шостымі. На алімпіядзе 2008 года ў Пекіне ён заваяваў бронзу, а ў 2016 годзе ў Рыа-дэ-Жанэйра — серабро.

«Я буду старацца апраўдваць ускладзеныя на мяне абавязкі. Спадзяюся, што гэта зробіць мяне мацнейшым. Я ўпэўнены, што камандай федэрацыі, нашай нацыянальнай камандай, абласнымі аддзяленнямі мы зможам зрабіць многае. Мы павінны быць адзінай сям'ёй, якая вырашае свае праблемы разам. І мы дапаможам Вадзіму Анатолевічу хутчэй усё вырашыць і вярнуцца. Будуць новыя праекты, будуць працягнуты тыя, што ўжо ёсць. Мы будзем імкнуцца знаёміць кожную сям'ю з лёгкай атлетыкай», — адзначыў Іван Ціхан.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Будзь у курсе!

# Прызначаны новы цягнік

**У мэтах павышэння ўзроўню транспартнага абслугоўвання насельніцтва Беларуская чыгунка з 27 верасня да 26 кастрычніка прызначыла новы цягнік, які па нядзелях і панядзелках звязжа тры абласныя цэнтры — Гомель, Магілёў і Віцебск.**

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, цягнік № 697/698 будзе адпраўляцца з Гомеля па нядзелях у 17.16 і прыбываць у Віцебск у 23.26. У адваротным кірунку з Віцебска цягнік адпраўвіцца ўжо пасля поўначы — у 1.00 панядзелка і ў 7.36 прыбудзе на станцыю Гомель. Па дарозе састаў зробіць прыпынкі на станцыях Буда-Кашалёўская, Жлобін, Рагачоў, Быхаў, Магілёў, Шклоў і Орша.

Кошт праезду ў плацкартным вагоне ад Гомеля да Віцебска складзе 10,96 рубля, а ў купэйным — 15,20 рубля.

Падрабязнасці аб раскладзе і кошце праезду можна даведацца праз мабільны дадатак «БЧ. Мой цягнік», на сайце pass.rw.by, а таксама па нумары 105 кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падпіска-2020

Звязда. Да чытача з любоўю!

# ДА СУСТРЭЧЫ Ў БАБРУЙСКУ!

**«Звязда» працягвае ладзіць сустрэчы з чытачамі ў розных рэгіёнах Беларусі. Гэтым разам мы накіроўваемся ў адзін з самых каларытных куткоў не толькі Магілёўшчыны, а бадай што і ўсёй Беларусі — старажытны Бабруйск.**

Дзень падпісчыка адбудзецца ў рэгіянальным вузле паштовай сувязі, што на вуліцы Мінскай, 21. Мы чакаем тут вас сёння з 11 да 15 гадзін. У гэты час можна не толькі аформіць падпіску на ўсе выданні Выдавецкага дома «Звязда», але і атрымаць таксама памятныя падарункі. Завітайце — будзе цікава!

Блізкая ўлада

# ПЫТАННІ? ПРАБЛЕМЫ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **26 верасня**, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- ✓ кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;
- ✓ намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- ✓ намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- ✓ намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- ✓ старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- ✓ старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- ✓ старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# СПАЧАТКУ ВЕТРАНА, ПОТЫМ ХОЛАДНА

## Калі ў суботу будзе прыпякаць — да плюс 27 градусаў, то ў сераду максімум — 11—18 цяпла

**Найбліжэйшыя дні верасня яшчэ пацешаць нас сапраўдным цяплом, аднак у выхадныя камфортнасць надвор'я парушыць моцны парывісты вецер, а на наступным тыдні пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу тэрыторыя краіны застанецца ў цёплай паветранай масе, удзень на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па заходнім рэгіёне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы чакаецца ад 9 цяпла па ўсходзе да плюс 17 градусаў па захадзе краіны, удзень будзе 21—27 цяпла.

Пад уплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з тэрыторыі Украіны, мы трапім у нядзелю. Уначы па паўднёвым захадзе, удзень на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. У многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла, удзень — ад плюс 17 градусаў да плюс 23.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні тэмпературны фон пачне паступова паніжацца і наблізіцца да звычайных для канца верасня значэнняў. У панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы будзе ад 7 да 14 цяпла, удзень — плюс 13—20 градусаў. Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца ў аўторак і сераду. Тэмпература паветра ў аўторак уначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль, удзень — плюс 13—20 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны — да 22 цяпла.

Пералом надвор'я на восень сіноптыкі чакаюць ужо ў сераду. Максімальная тэмпература ўдзень складзе 11—18 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**